УДК 741+378.147 025.7

# ВЫКЛАДЧЫК ТВОРЧЫХ ДЫСЦЫПЛІН ЯК СУБ’ЕКТ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

**Барбарчык М. І., дацэнт**
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*
*Мінск, Беларусь*

Анатацыя: у артыкуле разглядаюцца надзенныя пытанні сістэмы мастацкай адукацыі на падрыхоўчым аддзяленні, а таксама ўплыў асабістых педагагічных якасцей выкладчыка на працэс навучання.

Ключавыя словы: адукацыя, педагагічнае майстэрства, выкладчык, здольнасці, навучэнец, творчасць.

## THE TEACHER OF ART DISCIPLINES AS SUBJECT OF EDUCATIONAL PROCESS

**Barbarchik N. I., assistant professor**
*Belarusian National Technical University, Minsk, Belarus*

Summary: this article is devoted to urgent issues (problems) of art education system at the preparatory department, and there is also an analysis of how teacher’s personal pedagogical qualities influence the teaching process.

Key words: education, pedagogical skill, teacher, student, capabilities, art.

З развіццем акадэмічнай школы навучання патрабаванні да мэтаў і задач адукацыі набылі сістэмны і інавацыйны характар. У сувязі з гэтым узрастае неабходнасць у творчым развіцці падрастаючага пакалення, здольнага зразумець, прааналізаваць і разумна пераўтварыць у сваей практычнай дзейнасці навакольны свет. Нягледзячы на дадзеную ад прыроды здольнасць да творчай дзейнасці, толькі правільна арганізаванае навучанне дае магчымасць забяспечыць высокі ўзровень развіцця закладзеных здольнасцей, фарміравнне якіх трэба пачынаць на ранніх стадыях развіцця асобы. У сувязі з гэтым узрастае роля выкладчыка ў развіцці крэатыўнасці, творчай індывідуальнасці навучэнца. Істотнае значэнне ў гэтым

працэсе займае выяўленчае мастацтва, выкладанне якога з’яўляецца найбольш эфектыўным сродкам выхавання і разіцця, паколькі абуджаюцца творчыя сілы навучэнца, актывізуюцца яго ўяўленне, успрыманне і фантазія.

Эфектыўнасць заняткаў выяўленчым мастацтвам залежыць ад асобы выкладчыка, яго захопленасці, здольнасці ўдзельнічаць у сутворчасці. Развіцце крэатыўнасці навучэнцаў у працэсе мастацкага выхавання будзе паспяхова ажыццяўляцца тады, калі асновай педагагічнага ўздзеяння на ўсіх этапах навучання будзе галоўны прынцып, які вызначае развіцце чалавецтва, – творчасць. Пры гэтым неабходна шчыльнае злучэнне навучання выяўленчаму мастацтву з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі ў адзінае цэлае, што несумненна ўзмацніць выхаваўчы патэнцыял гуманістычнага ўздзеяння на асобу і з’явіцца асновай яе гарманічнага развіцця.

На конт ролі творчасці ў дзейнасці выкладчыка выказваецца Д. І. Вадзінскі: ″Зыходным пачаткам творчасці, яго фундаментам з’яўляецца педагагічнае майстэрства – комплекс ведаў і якасцей асобы, які забяспечвае высокі ўзровень самарэалізацыі прафесійна-педагагічнай дзейнасці″ [3, с. 199]. Даследчык вызначае шэраг наступных агульнаадукацыйных кампанентаў педагагічнага майстэрства: гуманістычная накіраванасць, камунікатыўныя здольнасці, перцэптыўныя здольнасці, дынамізм асобы, эмацыйная ўстойлівасць, крэатыўнасць, педагагічная тэхніка, культура. Дадзеныя кампаненты з’яўляюцца арыенцірамі як для выкладчыкаў творчых дысцыплін, так і для педагогаў іншых прадметаў.

Зыходзячы з вышэй сказанага, трэба адзначыць, што інтарэсы выкладчыка, яго каштоўнасці і ідэалы, якія маюць гуманістычную накіраванасць, з’яўляюцца арыенцірам у адукацыі і выхаванні вучняў, а ў далейшым, магчыма, іх жыццевым крэда. Важным з’яўляецца высокі прафесійны ўзровень ведання прадмета і методыкі яго выкладання. Для педагога, які займаецца выкладаннем такіх дысцыплін, як ″Рысунак″ альбо ″Жывапіс″, істотным з’яўляеццца яго ўласная творчая дзейнасць, асабліва калі ен стварае прафесійныя жывапісныя, графічныя альбо скульптурныя творы і прымае сістэматычны ўдзел у мастацкіх выставах featureзнага ўзроўню. У выніку актыўная творчая дзейнасць дапамагае выкладчыку, па-першае, падтрымліваць належны прафесійны ўзровень, па-другое, з боку вучняў мець пэўную павагу. Заўважана, што калі выкладчык мае ў

навучэнцаў аўтарытэт творцы-прафесіянала, то вучні больш уважліва ставяццца да заўваг, правак і прапаноў, праяўляюць большую матывацыю пры выкананні заданняў. У сувязі з гэтым трэба дадаць, што сфарміраваць вучня як творчую асобу можа толькі той выкладчык, які сам працуе творча і які здольны стварыць вучэбную сістэму праблем і праблемных задач, рашэнне якіх будзе садзейнічаць развіццю творчага мыслення вучняў.

Важным кампанентам педагагічнага майстэрства з’яўляецца камунікатыўнасць, якая дазаляе людзям наладжваць добразычлівыя адносіны. Заўважана, што калі выкладчык праяўляе прыхільнасць і таварыскасць у дачыненні да сваіх калег альбо вучняў, то гэта стварае пазітыўную атмасферу ў калектыве, спрыяе нармальнаму і прадуктыўнаму правядзенню заняткаў. Выкладчык таксама павінен валодаць здольнасцю прафесійнай назіральнасці і педагагічнай інтуіцыі, што непасрэдна дапамагае наладжваць правільны кантакт з вучнямі. Звычайна навучэнцам бывае невядома, як падрыхтаваць сродкі для выканання заданняў, наладзіць рабочае месца, альбо на занятках па рысунку вучань (слухач падрыхтоўчага аддзялення) пачынае выконваць вучэбнае заданне, але не праяўляе рашучасці. Ен атрымаў тэарэтычныя веды, але ўсе ж такі не мае практычнага вопыту. І ў першым, і ў другім выпадку знешне гэта можа выглядаць як сімуляцыя, але на самой справе гэта праяўленне з боку навучэнцаў недарэчнай сціпласці і адсутнасці вопыту, што ў далейшым можа прывесці да закамплексаванасці. Выкладчык у такіх выпадках павінен прыйсці на дапамогу, каб своечасова выправіць сітуацыю, праявіўшы максімум уважлівасці, далікатнасці і педагагічнага такту. Здараюцца выпадкі, калі вучні паводзяць сябе шумліва, фэнабэрыста, непаважліва ставяцца да аднагрупнікаў і выкладчыка, дэзарганізуючы вучэбны працэс. У такім выпадку педагог не закрывае вочы на недапушчальныя ўчынкі і робіць строгую заўвагу, але зроблена гэта павінна быць карэктна. Менавіта разуменне псіхалагічных здольнасцей, характару вучня, здольнасць правільна вызначыць узровень яго ведаў, перакананняў, маральных якасцей – неабходнае і карыснае ў рабоце педагога.

На занятках па рысунку заўважана, што слухачы падрыхтоўчага аддзялення звычайна праяўляюць інэртнасць пры выкананні доўгатэрміновых заданняў альбо адмаўляюцца рабіць замалеўкі і накіды, ігнаруючы парады педагога. У такім выпадку менавіта такая

псіхалагічная якасць у паводзінах, як дынамізм, дазваляе выкладчыку актывізаваць вучэбны працэс альбо пераканаць навучэнцаў у карыснасці выканання хуткіх рысункаў. Пры навучнні выяўленчаму мастацтву эмацыйная ўстойлівасць дазваляе выкладчыкам у розных непрадказальных абставінах зберагаць самавалоданне і самарэгуляцыю, а педагагічная крэатыўнасць дазваляе прымяняць нестандартныя метады адукацыі і вызначаецца здольнасцю зацікаўліваць вучняў інавацыйнымі ідэямі, захопліваць творчым падыходам, выклікаць пэўныя станоўчыя эмоцыі.

Несумненна, што комплекс ведаў і ўласцівасцей асобы, набытых ў час практычнай дзейнасці, забяспечвае высокі ўзровень прафесійнай самарэалізацыі. Але ў працы мастака-педагога абавязкова ўзнікаюць пытанні, на якія не існуе гатовых адказаў альбо рэцэптаў для іх вырашэння. Гэта натуральна, бо выкладанне любога прадмета – працэс, безумоўна, творчы, які патрабуе ад выкладчыка пастаяннага пошуку, ініцыятывы і ўдумлівага падыходу. Менавіта ў выкладанні асноў выяўленчай граматы ўзнікаюць найбольш складаныя і шматлікія перашкоды, з’яўляецца неабходнасць задумацца над пытаннямі методыкі навучання. У сувязі з гэтым галоўнае значэнне мае стратэгічная лінія, накіраваная на паслядоўнае вырашэнне адукацыйных задач, іх ускладненне, выпрацоўка творчага пачатку ў акадэмічным навучанні, дзе агульнаметадычныя прынцыпы, адлюстраваныя ў праграмах, вучэбных планах і метадычнай літаратуры, у спалучэнні з творчым вопытам мастака, яго педагагічным майстэрствам і складаюць асноўную крыніцу, якая ажыўляе і накіроўвае працу выкладчыка.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Харламаў І. Ф. Педагогіка / І. Ф. Харламаў. – Мн., 1996. – 287 с.

2. Митина Л. М. Психология профессионального развития учителя / Л. М. Митина. – М., 1998. – 344 с.

3. Водзинский Д. И. Педагогика высшей школы: монография / Д. И. Водзинский. – Мн., 2000. – 372 с.